

# СЛАЎНЫ СЫН БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

## Да 80-годдзя з дня нараджэння А. Р. Чарвякова

Вялікі Кастрычнік узняў і вылучыў у першыя рады барацьбітоў за шчасце народнае слаўнага сына беларускага народа Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова. Яго жыццё неаддзельнае ад гісторыі Савецкай Беларусі ў першыя яе два дзесяцігоддзі.

Аляксандр Рыгоравіч нарадзіўся 8 сакавіка 1892 г. у невялікай вёсачцы Дукорка цяпер Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. З 14 гадоў сам зарабляў на жыццё і вучобу. Працаваў на будаўніцтве дарог, грузчыкам у аптовых магазінах, займаўся перапіскай папер, даваў урокі і г. д.

У 17 гадоў Чарвякоў вытрымаў экзамен на званне народнага настаўніка і тры гады працаваў у сельскіх школах. Потым паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут.

1 кастрычніка 1915 года А. Р. Чарвякоў быў прызваны ў царскую армію. Першы час ён служыў у розных часцях радавым. Праз некалькі месяцаў, як маючы адукацыйны цэнз, быў залічаны юнкерам у Маскоўскае Аляксандраўскае ваеннае вучылішча, дзе атрымаў званне прапаршчыка. У чыне малодшага афіцэра служыў у 11-м пяхотным Сібірскім стралковым запасным палку, які размяшчаўся ў Іркуцку. Тут ён блізка пазнаёміўся з рэвалюцыйна настроенымі салдатамі і афіцэрамі, прымаў удзел у рабоце рэвалюцыйных салдацкіх гурткоў.

У лютым 1917 года Аляксандр Рыгоравіч камандзіруецца на курсы кулямётчыкаў у афіцэрскую ваенную школу ў Араніенбауме (пад Петраградам). Там і застала яго Лютаўская рэвалюцыя. «З першых дзён рэвалюцыі, — пісаў Аляксандр Рыгоравіч у сваёй біяграфіі, — пачала мучыць думка аб неабходнасці быць разам з народам, служыць якому рыхтаваўся ў лепшыя гады маладосці». Ён блізка сыходзіцца з рэвалюцыйна настроенымі студэнтамі псіханеўралагічнага інстытута, сярод якіх былі і бальшавікі. У агні рэвалюцыйных падзей усё больш мацнеюць яго перакананні.

Пасля заканчэння школы Чарвякова ў чыне падпаручыка накіроўваюць у другі кулямётны полк на пасаду начальніка кулямётнай каманды. Салдаты-кулямётчыкі ў асноўным былі высокакваліфікаваныя рабочыя. Сярод іх нямала было бальшавікоў. Пад іх уплывам канчаткова вызначаюцца яго палітычныя перакананні, і ў маі 1917 года Аляксандр Рыгоравіч уступае ў рады бальшавіцкай партыі. Па даручэнню партыйнай ячэйкі становіцца лектарам па палітычных пытаннях у сваёй роце, а затым — палку.

У перыяд ліпеньскіх падзей, калі па ініцыятыве салдат 1-га кулямётнага палка ў Петраградзе пачалася стыхійная дэманстрацыя працоўных пад лозунгам «Уся ўлада Саветам!», Чарвякоў з ротай кулямётчыкаў выйшаў разам з салдатамі Маскоўскага, Паўлаўскага, Грэнадзёрскага, 180-га запаснога і іншых рэвалюцыйных палкоў.

Улетку 1917 года Чарвякоў пазнаёміўся з работай беларускіх груп. У той час у Петраградзе і бліжэйшых да горада вёсках налічвалася звыш 17 тысяч бежанцаў-беларусаў. У асноўным гэта былі рабочыя і сяляне. Пры яго актыўным удзеле восенню 1917 года ў Петраградзе быў ліквідаваны буржуазны Беларускі камітэт бежанцаў і выбраны новы, у асноўным бальшавіцкі. Многія беларусы актыўна ўдзельнічалі ў Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. Сам Аляксандр Рыгоравіч у перыяд Кастрычніка выконваў асобныя заданні Петраградскага партыйнага камітэта, а сфарміраваны ім з беларусаў рэвалюцыйны атрад прыняў удзел у баях з контррэвалюцыйнымі войскамі генерала Краснова на Пулкаўскіх вышынях.

У пачатку снежня 1917 года, калі была створана Усерасійская надзвычайная камісія па барацьбе з контррэвалюцыяй, сабатажам і спекуляцыяй, Аляксандр Рыгоравіч стварыў з былых бежанцаў першы атрад асобага прызначэння і перадаў яго ў распараджэнне ВЧК.

14 лютага 1918 года Аляксандр Рыгоравіч вылучаецца на адказную пасаду — камісара па беларускіх справах пры Саўнаркоме РСФСР. Калі германскія войскі пачалі наступленне, рабочыя-беларусы праявілі высокую рэвалюцыйную свядомасць. А. Р. Чарвякоў у Нарвскім раёне стварыў кулямётную каманду, якая пайшла на фронт у першых радах рабочых Петраграда.

У жніўні 1918 года Чарвякоў быў назначаны камісарам дывізіі, якая дзейнічала на Паўднёвым фронце. Але поезд, на якім ён ехаў, пацярпеў крушэнне, і паранены Чарвякоў трапіў у шпіталь. Пасля выздараўлення, у кастрычніку гэтага ж года, Маскоўскі акруговы ваенны камісарыят накіраваў Аляксандра Рыгоравіча начальнікам культурна-асветнага аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў, створанага пры Наркамаце па ваенных справах. Адначасова ён вёў вялікую партыйную работу ў Беларускім бюро ЦК РКП(б), прымаў самы актыўны ўдзел у стварэнні і абвяшчэнні Беларускай Савецкай Рэспублікі.

А. Р. Чарвякоў удзельнічаў у рабоце Першага з'езда Кампартыі Беларусі, у ліку чатырох членаў Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага ўрада падпісаў маніфест аб утварэнні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. А. Р. Чарвякоў быў назначаны народным камісарам асветы рэспублікі, выбраны членам Цэнтральнага бюро КП(б) Беларусі. Аляксандр Рыгоравіч аддаваў шмат сіл арганізацыі народнай адукацыі. Прадметам асаблівай увагі А. Р. Чарвякова было стварэнне універсітэта, ён удзельнічаў у рабоце камісіі па распрацоўцы навучальных планаў і падбору выкладчыцкіх кадраў, падрыхтоўчых курсаў для тых, хто рыхтаваўся да паступлення ва універсітэт.

Разам з А. Ф. Мясніковым А. Р. Чарвякоў рыхтаваў Першы Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся 2—3 лютага 1919 года ў Мінску. Прадстаўнікі беларускага народа прынялі першую Канстытуцыю Беларускай ССР, выбралі органы ўлады — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў, зацвердзілі герб і флаг Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. У састаў ЦВК БССР ад фракцыі бальшавікоў увайшоў і А. Р. Чарвякоў. Ён прымаў удзел у аб'яднанні Літвы і Беларусі, увайшоў у састаў урада Літоўска-Беларускай рэспублікі.

У перыяд белапольскай акупацыі Аляксандр Рыгоравіч працаваў спачатку ў 16-й арміі, а затым стаў загадчыкам культурна-асветнага аддзела Палітычнага ўпраўлення арміі Заходняга фронту. Адначасова ён прымаў удзел у дзейнасці Мінскага губрэўкома, якому былі перададзены ўсе грамадзянскія справы Саўнаркома, ЦВК і Савета Абароны рэспублікі. Пасля ліквідацыі рэўкома Чарвякоў увайшоў у састаў Літоўска-Беларускага аддзела пры ЦК РКП(б). 11 ліпеня 1920 года, у дзень вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй, Аляксандр Рыгоравіч быў назначаны старшынёй Мінскага губернскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, а ў канцы ліпеня — старшынёй Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта БССР.

На I сесіі ЦВК БССР, якая адбылася назаўтра пасля завяршэння работы II Усебеларускага з'езда Саветаў, А. Р. Чарвякоў быў выбраны Старшынёй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР і зацверджаны Старшынёй Савета Народных Камісараў рэспублікі.

А. Р. Чарвякоў быў адным з ініцыятараў стварэння Саюза Савецкіх Рэспублік, 50-годдзе з дня ўтварэння якога народы нашай краіны будуць адзначаць сёлета. Ён узначаліў дэлегацыю на X з'езд Саветаў РСФСР. Звяртаючыся да дэлегатаў з'езда Саветаў, Аляксандр Рыгоравіч заявіў: «Працоўныя Беларусі будуць ганарыцца, калі вы прымеце нашу прапанову, дзякуючы чаму рабочыя і сяляне Беларусі стануць адны-

**А. НЯТЫЛЬКІН,**
**старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі, кандыдат гістарычных навук.**



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы